# Каляндар падзей Камянеччыны на 2024г.

**У 2024 годзе спаўняецца:**

- **635 гадоў** з часу пераходу г. Каменца пад уладу літоўскага князя Ягайлы (1389)
- **615 гадоў** з пачатку фарміравання запаведнага рэжыму ў **БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ** (Камянецкі, Пружанскі, Свіслацкі р-ны) (1409г.), сёння - **"НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПАРК "БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА"**
- **530** гадоў з часу атрымання **г. ВЫСОКАЕ МАГДЭБУРГСКАГА ПРАВА І ГЕРБА** (Камянецкі р-н), 1494г.)
- **160 гадоў** з часу пабудовы **ХРАМА СВЯТЫХ АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА** (29.06.1864, Камянецкі р-н, в. Гарадзішча)
- **155** гадоў з часу пабудовы **ХРАМА УЗВЯДЗЕННЯ КРЫЖА ГАСПОДНЯГА** (27.09.1869, Камянецкі р-н, г. Высокае), помніка архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю
- **155** гадоў з часу пабудовы **ХРАМА СВЯТОЙ ВЯЛІКАМУЧАНІЦЫ** ВАРВАРЫ (12.10.1869, Камянецкі р-н, в. Сухадол)
- **110** гадоў з часу пабудовы **ХРАМА ПРП. СІМЯОНА СТОЎПНІКА** (1914, г. Камянец)
- **15 гадоў з часу пабудовы ХРАМА ВЯЛІКАМУЧАНІКА ГЕОРГІЯ ПЕРАМОЖЦА** (1.10.2009, Камянецкі р-н, **агр. Камянюкі**)
- **85** гадоў з часу адкрыцця **ПЕЛІШЧАНСКАЙ СЕЛЬСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ** (1939)
- **80** гадоў з часу адкрыцця **Відамлянскай сельскай бібліятэкі** (1944)
- **80** гадоў з часу адкрыцця **Вайскоўскай сельскай бібліятэкі** (1944)
- **80** гадоў з часу адкрыцця **Дзмітровіцкай сельскай бібліятэкі** (1944)
- **80** гадоў з часу адкрыцця **Камянецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя У. М. Ігнатоўскага**(16.10.1944г.)
- **80** гадоў з часу адкрыцця **Навіцкавіцкай сельскай бібліятэкі** (1944)
- **80** гадоў з часу адкрыцця **Рэчыцкай сельскай бібліятэкі** (1944)
- **75 гадоў з часу адкрыцця Камянецкай раённай дзіцячай бібліятэкі** (1949)
- **70 гадоў** з часу адкрыцця **Хадасоўскай сельскай бібліятэкі** (1954)

**155 гадоў** з дня нараджэння **ЛЕАНІДА ЦІХАНАВІЧА ЛЕВІНА Левіна (Леон Танхелевіч)** (1869, Высока-Літоўск Гродзенскай губерніі -

1944, Ташкент), савецкага отарыналарынголага, прафесара (1902), Заслужанага дзеяча навукі РСФСР (1935)

**75 гадоў з дня нараджэння ВЯЧАСЛАВА ФЁДАРАВІЧА САЎЧУКА** (1949, в. Панікві, Камянецкі р-н), кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта

**2 студзеня** – **75** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ ФЁДАРАВІЧА САРОКІ** (1949, в. Асіннікі, Камянецкі р-н), беларускага вучонага ў галіне тэрапіі і рэўматалогіі, выдатніка аховы здароўя Беларусі, выдатніка друку Беларусі

**4 студзеня – 80** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ УЛАДЗІМІРАВІЧА САЛЯМАНОВІЧА** (1944, г. Камянец), педагога, трэнера

**16 студзеня – 75** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ МІХАЙЛАВІЧА УЛАСЮКА** (1949, в. Кунахавічы, Камянецкі р-н), генерал-маёра міліцыі

**22 студзеня** – **220** гадоў з дня нараджэння **ФЕЛІКСА ЮЗЭФАВІЧА ЛЯХОВІЧА** (1804, **Высока-Літоўск**, - 1878), удзельніка рэвалюцыйнага руху 1-й паловы 19 ст.

**15 лютага** – **80** гадоў з дня нараджэння **ВОЛЬГІ ПАЎЛАЎНЫ ШУТАВАЙ** (1944, в. Загарадная, Камянецкі р-н – 1999), спявачкі, заслужанай артысткі Беларусі

**23 лютага - 95** гадоў з дня нараджэння **ГЕОРГІЯ ПЯТРОВІЧА АНДРАЮКА** (1929, в. Выгнанка, Камянецкі р-н), гісторыка

**Сакавік** – **65** гадоў з часу стварэння саўгаса **“БЕЛАВЕЖСКІ”** Камянецкага р-на (1959)

**15 сакавіка** – **100** гадоў з дня нараджэння **МІХАСЯ БЕЛЯМУКА** (1924, в. Пагранічная, Камянецкі р-н), дзеяча беларускай эміграцыі

**19 сакавіка** – **85** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА УЛАДЗІМІРАВІЧА СВЕНТАХОЎСКАГА** (1939, **в. Зубачы** Камянецкі р-н (цяпер – тэрыторыя Польшчы) – 2006), беларускага жывапісца, педагога, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2000)

**20 красавіка** – **65** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МІКАЛАЕВІЧА ЧЫКВІНА** (1959, г. Высокае), разьбяра па дрэве, жывапісца

**1 мая – 90** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ МІКАЛАЕВІЧА ХВІСЮКА** (1934, в. Яцкавічы, Камянецкі (цяпер Брэсцкі р-н), дырыжора хора

**17 мая** – **90** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ ІВАНАВІЧА ЯКАЎЛЕВА** (1934, в. Лісоўчыцы, Камянецкі р-н), вучонага-гісторыка, даследчыка, заслужанага работніка народнай адукацыі Беларусі

**6 чэрвеня** – **85** гадоў з дня нараджэння **ІОСІФА СЦЯПАНАВІЧА БАЛЮКА** (1939. в. Седруж, Камянецкі р-н), свяшчэнніка

**6 чэрвеня** – **140 гадоў** з дня нараджэння **МІКАЛАЯ МАКАРАВІЧА ІГНАТОЎСКАГА** (1884, в. Такары, Камянецкі р-н – 1942), урача, дзеяча культуры (фалькларыста, музыканта, кампазітара)

**15 чэрвеня** – **260** гадоў з дня нараджэння **ЗІГМУНДА ФОГЕЛЯ (ПТАШАКА)** (1764, в. Воўчын, Камянецкі р-н – 1826), польскага мастака, графіста, педагога

**18 чэрвеня – 135** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА СЯМЁНАВІЧА КАЛІНОЎСКАГА** (18.06.1889, в. Баранкі Брэсцкага павета, ці Ваўкавыск – 1940?, Старабельск Варашылаўградскай вобласці), беларускага грамадска-палітычнага дзеяча, дэпутата польскага Сейма

**20 чэрвеня** – **70** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МІКАЛАЕВІЧА САВЕНКА** (1954, в. Мартынюкі, Камянецкі р-н), генерал-маёра

**26 ліпеня** – **80** гадоў з дня нараджэння **ЛЕАНІДА ІБРАГІМАВІЧА ДРУЯНА** (1944, г. Каменец), урача-тэрапеўта

**30 ліпеня** – **80** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ СЯМЁНАВІЧА МІЦКОВІЧА** (1944, в. Забалацце, Камянецкі р-н), настаўніка, сацыёлага, краязнаўцы

**2 жніўня – 80** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ МІКАЛАЕВІЧА ЯФІМАВА** (1944, в. Зарэчча, Камянецкі р-н), інжынера-механіка

**12 жніўня - 100** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ ВАСІЛЬЕВІЧА ШАРАМЕТА** (1924, в. Лазавіца (існавала ў Воўчынскім с/С - ?), даследчыка дынамічных з’яў у моўнай сістэме і маўленні, беларускага мовазнаўцы

**19 жніўня** – **80** гадоў з дня нараджэнн **ГЕОРГІЯ ПЯТРОВІЧА ПАРАФЯНЮКА** (1944, в. Дзмітровічы, Камянецкі р-н), настаўніка, журналіста

**15 верасня** – **65** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА АЛЯКСЕЕВІЧА ШЫШКО** (1959, в. Відамля, Камянецкі р-н), гаспадарчага дзеяча

**21 верасня** – **85** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ АЛЯКСЕЕВІЧА ЖУКОВІЧА** (1939, **в. Забалацце**, Камянецки р-н), пісьменніка

**29 верасня** – **135** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ ЯЎГЕНАВІЧА САКСЫ** (1889, в. Ліпна, Камянецкі р-н – 1938), удзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, палітработніка Чырвонай Арміі

**30 верасня – 65** гадоў з дня нараджэння **ТАМАРЫ ЯЎГЕНАЎНЫ НАЛІВАЙКА** (1959, в. Амелянец, Камянецкі р-н), сакратара-справавода, інструктара Брэсцкага абласнога савета БелАСТТ.

**1 кастрычніка - 75** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ САВЕЛЬЕВІЧА ТУРКОВА** (1949, г. Каменец), мастака, майстра разьбы па дрэве

**4 кастрычніка** – **280** гадоў з дня нараджэння **МІХАЛА ФРАНЦІШКА КАРПОВІЧА** (1744, г. Каменец – 1803), палітычнага і царкоўнага дзеяча, удзельніка паўстання 1794г., багаслова-асветніка

**15 кастрычніка** – **125** гадоў з дня нараджэння **ПРАСКОЎІ ФЁДАРАЎНЫ ДЗМІТРУК** (1899, в. Лескі, Камянецкі р-н – 1978), удзельніцы рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі

**8 лістапада – 115** гадоў з дня нараджэння **ЮЗЭФА ХАРЫТОНА (**1909, в. Крупіцы Бельскага павета Гродзенскай губерніі – 1975), мастака, які доўгі час жыў у Высока-Літоўску, сведкі жудаснай трагедыі знішчэння яўрэяў.

**11 лістапада** – **310** гадоў з дня нараджэння **МАРЦІНА МАТУШЭВІЧА** (1714, в.Ельня, цяпер – Радасць, Камянецкі р-н – 1773), грамадскага і дзяржаўнага дзеяча Рэчы Паспалітай, пісьменніка-мемуарыста, перакладчыка

**1 снежня – 290** гадоў з дня нараджэння **АДАМА КАЗІМІРА ЧАРТАРЫЙСКАГА** (1734, Данцыг — 19.03.1823), польскі дзяржаўны дзеяч, галава магнацкага рода Чартарыйскіх, уладальніка Воўчына

**25 снежня** – **100** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА СЦЯПАНАВІЧА ГУЛЬКО** (1924, в. Вайская, Камянецкі р-н), вучонага ў галіне медыцынскай рэабілітацыі, выдатніка аховы здароўя

**25 снежня** – **85** гадоў з часу абвяшчэння **НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПАРКУ "БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА",** дзяржаўнай прыродаахоўнай установы, якая ўключана ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА (Камянецкі, Пружанскі, Свіслацкі р-ны; 1939)

**29 снежня** – **60** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ УЛАДЗІМІРАВІЧА ВАЎЧКА** (1964, г. Каменец), беларускага скульптара.